В. А. Бардзіер

# ДЗЕЙНАСЦЬ ШТРАФНЫХ БАТАЛЬЁНАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Тэма штрафных частак Чырвонай Арміі перыяду Вялікай Айчыннай вайны і праз 75 гадоў пасля іх стварэння згодна з загадам народнага камісара абароны СССР І.В. Сталіна № 227 ад 28 ліпеня 1942 г. не страціла палітычнай вастрыні. Славуты загад № 227 у ліку мер па ўмацаванні дысцыпліны ў Чырвонай Арміі і забароне самавольнага адыходу з баявых пазіцый прадугледжаваў: "сформировать в пределах фронта от одного до трех (смотря по обстановке) штрафных батальона (по 800 человек), куда направлять средних и старших командиров и соответствующих политработников всех родов войск, провинившихся в нарушении дисциплины по трусости или неустойчивости, и поставить их на более трудные участки фронта, чтобы дать им возможность искупить кровью свои преступления против Родины". З той жа мэтай сфарміраваць "в пределах армии от пяти до десяти (смотря по обстановке) штрафных рот (от 150 до 200 человек в каждой), куда направлять рядовых бойцов и младших командиров". 28 верасня 1942 г. намеснік народнага камісара абароны Я. Шчадэнка выдаў загад № 298, у якім аб'яўляліся палажэнні аб штрафных батальёнах і іх штаты. Адпаведна гэтым дакументам, ваеннаслужачыя штрафных частак падзяляліся на сталы і пераменны склад. Сталы склад камплектаваўся "из числа волевых и наиболее отличившихся в боях командиров и политработников". Да яго адносілася камандаванне батальёна, афіцэры штаба і ўпраўлення, камандзіры рот, узводаў, палітрукі рот і ўзводаў, старшыны, пісары, санінструктары рот. Перменны склад, штрафнікі, незалежна ад ранейшага воінскага звання служылі радавымі, а таксама маглі быць прызначаныя на пасады малодшага каманднага складу. Па ўспамінах былых штрафнікоў, узбраенне гэтых частак нічым не адрознівалася ад узбраення звычайных стралковых падраздзяленняў. Забеспячэнне боепрыпасамі было бесперабойным. Тое ж можна казаць і пра арганізацыю харчавання. Штрафныя батальёны ў гады Вялікай Айчыннай вайны вырашалі тыя ж задачы, што і стралковыя часткі. Пры гэтым яны, як і прадугледжваў загад № 227, выкарыстоўваліся на найбольш небяспечных напрамках. Найбольш часта іх кідалі на прарыў абароны праціўніка, захоп і ўтрыманне важных населеных пунктаў і плацдармаў, правядзенне разведкі боем. Штрафныя часткі стойка і адважна дзейнічалі і ва ўмовах абароны. Таксама яны ўдзельнічалі ў фарсіраванні водных артэрый, у баявых дзеяннях у тыле ворага. Штрафнікі, якія атрымалі раненні ў баі, лічыліся адбыўшымі пакаранне, аднаўляліся ў званні і ва ўсіх правах і пасля выздараўлення накіроўваліся для далейшай службы ў звычайныя часткі, а інвалідам прызначалася пенсія. У большасці выпадкаў штрафнікоў вызвалялі ў тэрміны, устаноўленыя загадамі наркама абароны і яго наменікаў (ад 1 да 3 месяцаў). За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях, штафнікоў узнагароджвалі ордэнамі і медалямі, а некаторыя былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Малавядомы факт: для лётчыкаў, якія праявілі сабатаж, трусасць і шкурніцтва, ствараліся штрафныя авіаэскадрыллі. Загад народнага камісара абароны І.В. Сталіна № 0685 ад 9 верасня 1942 г. прадугледжваў іх стварэнне, аднак распаўсюджвання яны не атрымалі. Усяго ў Чырвонай Арміі з 1943 г. па май 1945 г. у асобныя перыяды налічвалася да 65 штрафных батальёнаў і да 1037 штрафных рот, аднак гэтыя лічбы нельга лічыць дакладнымі, так як колькасць шрафных частак пастаянна мянялася. Яны не былі ўстойлівымі падраздзяленнямі: адны расфарміроўваліся, іншыя перафарміроўваліся і г.д. Штрафныя падраздзяленні праіснавалі ў Чырвонай Арміі з верасня 1942 г. да мая 1945 г. Падчас вайны ў штрафныя часткі было накіравана 427901 чалавек. Для параўнання, праз савецкія Узброеныя Сілы за час вайны прайшлі 34 476,7 тыс. чалавек. Атрымліваецца, што доля военнаслужачых, пабываўшых ў штрафных ротах і батальёнах, складае толькі 1,24 Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны ўсе штрафныя падраздзяленні ў Чырвонай Арміі былі расфарміраваныя. Ваеннаслужачыя, што прайшлі праз іх, вынеслі на сабе ўсе цяжкасці, нястачы і жахі вайны, праявіўшы пры гэтым мужнасць і гераізм. Памяць пра гэта будзе жыць вечна.

*Бардиер Вадим Анатольевич,* студент Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, baxx062@mail.ru.
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,* доцент кафедры гуманитарных дисциплин Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, кандидат гуманитарных наук, Mikalayeva@bsuir.by .

Библиотека БГУИР